**МІХАЙЛАЎ ПАВЕЛ АЛЯКСАНДРАВІЧ** (н. 13.03.1950, в. Ушкавіца Кобрынскага р-на Брэсц. вобл.), беларускі лінгвіст, адзін з вядучых спецыялістаў у галіне дыялекталогіі. Канд. філал. н. (1981). Закончыў Брэсцкі дзярж. пед. ін-т імя А.С. Пушкіна па спецыяльнасці “Руская мова і літаратура” (1968) і аспірантуру Інстытута мовазнаўства імя Я. Коласа АН БССР (1979). Кандыдацкая дысертацыя прысвечана вывучэнню лексікі ганчарнага промыслу. Вучоны сакратар Інстытута мовазнаўства АН БССР (з 1983), загадчык аддзела дыялекталогіі і лінгвагеаграфіі (з 1986). З 1991 г. працуе ў БДПУ, з 1993 па 2009 гг. – загадчык каф. беларускага мовазнаўства. Кіраўнік навуковых праектаў “Асноўныя тэндэнцыі ў развіцці лексічнай сістэмы беларускай дыялектнай мовы” (2003 – 2006), “Нацыянальная мова і нацыянальная культура: аспекты ўзаемадзеяння” (2007 – 2010). Аўтар каля 300 работ у галіне беларускай дыялекталогіі, лінгвагеаграфіі, анамастыкі, тэрміназнаўства, гісторыі лінгвістыкі і акцэнталогіі. Прымаў удзел у стварэнні звыш 30 вучэбна-метадычных дапаможнікаў па беларускай мове для ВНУ і школ. Суаўтар дыялектных і тэрміналагічных слоўнікаў, адзін са стваральнікаў лексічнага атласа беларускай мовы, рэдактар тэрміналагічных выданняў па матэматыцы, аўтар аб’ёмнага цыкла публікацый, прысвечаных даследаванню найменняў роднасці і сваяцтва (Роднае слова, 1996 – 2010). Падрыхтаваў 8 кандыдатаў навук.

*Літ.*: Нацыянальная мова і нацыянальная культура: аспекты ўзаемадзеяння: нав. зборнік, прысв. 60-годдзю П.А. Міхайлава. Мн., 2009; Дзятко, Д. Адданы беларускай навуцы: да 60-годдзя П.А.Міхайлава // Роднае слова. 2010. №10; Міхайлаў П.А. (у суаўт.) Слоўнік беларускіх гаворак паўночна-заходняй Беларусі і яе пагранічча. Мн., 1979 – 1986; Міхайлаў П.А. (у суаўт.) Тураўскі слоўнік. Мн., 1982 – 1987; Міхайлаў П.А. (у суаўт.) Лексічны атлас беларускіх народных гаворак. Мн., 1993 – 1998.

*С.У. Шахоўская, Д.В. Дзятко*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ